12.*Ковалев, Б.Н.* Повседневная жизнь России в период нацистской оккупации / Б.Н. Ковалев. – М. : Мол. гвардия, 2011. – 618 с.


## ***Семінарскі занятак 9. СССР у 1945–1964 гг.***

1.Становішча Савецкага Саюза пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Супярэчнасці і канфлікты ў савецкім грамадстве.
2.Узрастанне дырэктыўнай ролі дзяржавы і культу асобы Сталіна. Палітычныя кампаніі і ідэалагічны клімат 1945 – 1953 г.
2. Выбар пасляваеннай мадэлі развіцця. Аднаўленне краіны. Вынікі аднаўленчага перыяду.
4. Прыход да ўлады М.С. Хрушчова. “Хрушчоўская адліга”. ХХ з’езд КПСС і кіруемая дэсталінізацыя.
5.Рэфарматарства ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльных адносінах. Развіццё культуры ва ўмовах “пацяплення”.
6. Плыні ў кіраўніцтве краінай. Спроба адстаўкі Хрушчова ў 1957 г.
7. СССР ва ўмовах разгортвання НТР. Супярэчлівы характар “адлігі” і эканамічныя праблемы. Прычыны і вынікі адстаўкі Хрушчова ў 1964 г.

Літаратура:


1. *Верт, А.С.* История Советского государства. 1900. – 1991./ Н. Верт. – М. : ИНРА – М, Изд-во "Весь мир", 2000. – 544 с.
2. *История России:* XX век: 1894 – 1939 / К.М. Александров и др., под ред. А.Б. Зубова. – М. : АСТ; Астрель, 2009. – 1023 с.
3. *История России:* XX век: учебное пособие для студентов исторических специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / О.А. Яновский и др.. Под ред. В.И. Меньковского и О.А. Яновского. – Мн. : РИВШ, 2005. – 703 с.
4. *История России* в новейшее время: учебник / Под ред. А.П. Безбородова. – М. : Инфра – М, 2004. – 416 с.
5. *Буйновский, Э.И.* Повседневная жизнь первых российских ракетчиков и космонавтов / Э.И. Буйновский. – М. : Молодая гвардия, 2005. – 311 с.
6. *Бурлацкий, Ф.М.* Никита Хрущев и его советники – красные, черные, белые /Ф. Бурлацкий. – М. : Эксмо-пресс, 2002. – 445 с.
7. *Мядзведзеў, Р.Н.* М.С. Хрушчоў. Палітычны партрэт / Р.Н. Мядзведзеў. – Мн. : Беларусь, 1989. – 240 с.


## *Семінарскі занятак 10. СССР у 1965–1985 гг.*

1. Прыход да ўлады Л.І. Брэжнева і прыярытэты кіравання. Развіццё экстэнсіўнай мадэлі планавай эканомікі. Эканамічная рэформа ў 1965 г. і яе вынікі. Крыніцы развіцця савецкай эканомікі ў 60-х–першай палове 80-х гг..
2. Змены ў сацыяльнай структуры СССР і жыццёвым ўзроўні насельніцтва.
3. Аднапартыйная сістэма і яе ўмацаванне паводле Канстытуцыі СССР 1977 г.. Ідэалагічны дыктат і дысідэнцкі рух.
4. Нарастанне крызісных з'яў у эканамічным і палітычным жыцці пры пераемніках Брэжнева (Ю.У. Андропаве, К.У. Чарненка). Спробы рэфармавання асобных сфер жыцця краіны.
5. Знешняя палітыка СССР. Разрадка і канфрантацыя ў адносінах з Захадам. СССР і краіны сацыялістычнага лагера.
6. Паўсядзеннае жыццё, асвета, навука, культуры савецкага грамадства.

Літаратура:


1. *Верт, А.С.* История Советского государства. 1900. – 1991./ Н. Верт. – М. : ИНРА – М, Изд-во "Весь мир", 2000. – 544 с.
2. *История России:* XX век: 1894 – 1939 / К.М. Александров и др., под ред. А.Б. Зубова. – М. : АСТ; Астрель, 2009. – 1023 с.
3. *История России:* XX век: учебное пособие для студентов исторических специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего

образования / О.А. Яновский и др.. Под ред. В.И. Меньковского и О.А. Яновского. – Мн. : РИВШ, 2005. – 703 с.
4. *История России* в новейшее время: учебник / Под ред. А.П. Безбородова. – М. : Инфра – М, 2004. – 416 с.
5. *Хоскинг, Дж.* История Советского Союза. 1917 – 1991 / Дж. Хоскинг. – Смоленск: Русич, 2001. – 496 с.
6. *Сергеев, Ю. В.* Новейшая история (1945 – 1999). Подробности / Ю.В. Сергеев. – М. : АСТ, 2000. – 568 с.
7. *Морен, Э.* О природе СССР: Тоталитарный комплекс и новая империя / Эдгар Морен. – М. : Науч.-изд. центр "Наука для о-ва", 1995. – 220 с.
8. *Л.И. Брежнев.* Материалы к биографии / Сост. Аксютин Ю.В. . – М. : Политиздат, 1991. – 384 с.

## *Семінарскі занятак 11. Палітычныя і эканамічныя працэсы 1985–1991 г. Распад СССР і развіццё постсавецкай прасторы*

1. Прыход да ўлады М.С. Гарбачова і рашэнні Красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС. Накірункі перабудовы.
2. Рэалізацыя задач перабудовы, яе вынікі і супярэчнасці ў розных галінах.
3. Нацыянальныя рухі ў рэспубліках СССР. Рэгіянальныя канфлікты. Фарміраванне шматпартыйенасці і апазіцыі.
4. Жнівеньскі путч 1991 г.. "Парад суверэнітэтаў" і "вайна законаў". Белавежскія пагадненні. Распад СССР і яго прычыны.
5. Расія як спадкаеміца СССР. Праблема раззбраення. Прэзідэнцтва Б.М. Ельцына. Новыя з'явы ў эканоміцы, палітычным і сацыяльным жыцці Расіі.
6. Кіраванне У.У. Пуціна і Д.А. Мядзведзева. Асноўныя накірункі і вынікі знешняй палітыкі і ўнутранага развіцця Расіі ў пачатку XXI ст..
7.Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін былога СССР. Спробы мадэрнізацыі эканомікі і пошукі арыеціраў у знешняй палітыцы.

Літаратура:

1. *Верт, А.С.* История Советского государства. 1900. – 1991./ Н. Верт. – М. : ИНРА – М, Изд-во "Весь мир", 2000. – 544 с.
2. *История России:* XX век: 1894 – 1939 / К.М. Александров и др., под ред. А.Б. Зубова. – М. : АСТ; Астрель, 2009. – 1023 с.
3. *История России:* XX век: учебное пособие для студентов исторических специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / О.А. Яновский и др.. Под ред. В.И. Меньковского и О.А. Яновского. – Мн. : РИВШ, 2005. – 703 с.
4. *История России* в новейшее время: учебник / Под ред. А.П. Безбородова. – М. : Инфра – М, 2004. – 416 с.

5. *Хоскинг, Дж.* История Советского Союза. 1917 – 1991 / Дж. Хоскинг. – Смоленск: Русич, 2001. – 496 с.
6. *Сергеев, Ю. В.* Новейшая история (1945 – 1999). Подробности / Ю.В. Сергеев. – М. : АСТ, 2000. – 568 с.
7. *Зенькович, Н.А.* Тайны уходящего века / Н.А. Зенькович. – М. : Олма-пресс, 1998. – 585 с.
8. *Шевченко, В.Н.* Повседневная жизнь Кремля при президентах / В.Н. Шевченко. – М. : М. : Мол. гвардия, 2004. – 468 с.

## *Семінарскі занятак 12. Краіны Цэнтральнай і Паўднева-Усходняй Еўропы з 1945 г. да нашых дзён*

1. Агульныя ўмовы палітычнага развіцця краін Цэнтральнай і Паўднева-Усходняй Еўропы. Усталяванне савецкай палітычнай мадэлі. Стварэнне сістэмы Варшаўскага дагавора.
2. Асноўныя прынцыпы і мясцовыя асаблівасці эканамічнага развіцця. Стварэнне СЭУ.
3. Унутрыпалітычнае развіцце краін Варшаўскага дагавора. Апазіцыйны рух. Падзеі 1956 і 1968 гг. У Венгрыі і Чэхаславакіі, праблемы адносін СССР з Югаславіяй, рух “Салідарнасць” у Польшчы.
4. Перабудова ў СССР. Змены ва ўнутрыпалітычным развіцці краін савецкай мадэлі. Распад СССР і крушэнне Варшаўскага дагавора.
5. Праблемы развіцця і знешнепалітычнай арыентацыі краін былога Варшаўскага дагавора. Пашырэнне НАТА і Еўрасаюза. Пошукі знешнепалітычных арыенціраў ва ўмовах аднапалярнага міра.

*Літаратура*

1. *Всемирная история:* Итоги второй мировой войны / А. Н. Бадак, И. В. Войнич, Н. М. Волчек и др. – Мн.: Харвест; М.: АСТ, 2002. - С. 88-113.
2. *История Европы* с древнейших времен до наших дней: В 8 т. / Редкол. О. А. Чубарьян и др. – М.: Наука, 2000. – Т. 8.
3. *Новейшая история* стран Европы и Америки. XX в.: В 3 ч. / Под ред. А. М. Родригеса, М. В. Пономарева. – М.: Изд. Центр “Владос”, 2001. – Ч. 3. С. 96-191.
6. *Новейшая история* зарубежных стран: Европа и Америка (1917-1945) / Под ред. В. К. Фураева. – М.: Просвещение, 1989. – 447 с.
7. *Заболотный, В. М.* Новейшая история стран Европы и Северной Америки: Конец XX – начало XXI века / В.М. Заболотный. – М.: ООО “Издательство АСТ”, ООО “Издательство Астрель”, 2004. – С. 292-395.
8. *«Восточноевропейский социализм»:* становление режима, попытки его модификации, причины поражения / Отв. ред. Ю.С. Новопашин. – М.: ИСБ, 1992. – 473 с.

9. *Бывшие* «хозяева» Восточной Европы: Политические портреты / Отв. ред. Ю.С. Новопашин. - М.: ИСБ, 1995. – 308 с.
10. *Политические кризисы* и конфликты 50-х – 60-х гг.в Восточной Европе/ Ред.-сост. Б.И. Желицкий. – М. : Рос. ин-т славяноведения и балканистики, 1993. – 230 с.

### *Семінарскі занятак 13. Лацінская Амерыка ў другой палове XX – пачатку XXI ст.*

1. Вынікі Другой сусветнай вайны для Лацінскай Амерыкі. Нацыянал-рэфармізм і палітычная нестабільнасць у краінах.
2. Асаблівасці і праблемы эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця лацінаамерыканскіх краін.
3. Кубінская рэвалюцыя і яе вынікі. Развіццё Кубы ў другой палове XX – пачатку XXI ст..
4. Чылійская рэвалюцыя 1970 – 1973 гг. Дыктатура Пінатэта. Чылі на сучасным этапе.
5. Лацінская Амерыка ў 80-х гг. XX ст.. Нікарагуанскя рэвалюцыя. Падзенне ваенных дыктатур.
6. Лацінская Амерыка на сучасным этапе.

Літаратура:

1. *Всемирная история* новейшего времени: Справ. пособие / Е.А. Долгучиц, Е.Г. Колб, В.И. Меньковский и др. – Мн. : Экоперспектива, 1998. – 203 с.
2. *Мировая история* новейшего времени: В 2 ч. / Г.М. Кривощёкий, М.Я. Колоцей, М.В. Мартен и др. – Гродно, ГрГу, 1998.
3. *Новейшая история* стран Европы и Америки. XX в.: В 3 ч. / Под ред. А.М. Родригеса., М.В. Пономарева – М. : Изд. центр “Владос”, 2001.
4. *Гонионский, С.А.* Сандино / С.А. Гонионский. – М.: Мол. гвардия, 1965. – 160 с.
5. *Лаврецкий, И.Р.* Эрнесто Че Гевара / И.Р. Лаврецкий. – М. : Мол.гвардия, 1978. – 349 с .
6. *Лаврецкий, И.Р.* Сальвадор Альенде / И.Р. Лаврецкий. – М. : Мол.гвардия, 1975. – 288 с .

## 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ.
## 4.1. ЗАДАННІ ДЛЯ КАНТРАЛЮЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

### Тэма 1. Лакальныя войны і канфлікты пасля Другой сусветнай вайны.

1. Лакальныя ваенныя сутыкненні як увасабленне барацьбы звышдзяржаў за сферы ўплыву ва ўмовах біпалярнага свету. Вайна ў Карэі і В'етнаме.
2. Араба – ізраільскі канфлікт на Блізкім Усходзе і спробы яго ўрэгулявання на сучасным этапе..
3. Вайна ў Афганістане. Становішча ў краіне пасля вываду савецкіх войскаў.
4. Вайна ў Югаславіі і сучаснае становішча ў рэгіёне.
5. Супрацьстаянне Ірака і ЗША. Вайна ў Іраку і сучаснае становішча ў краіне.

*Літаратура:*


1. Новейшая история стран Азии и Африки: XX век: Учебник для студентов высших учебных заведений: В 3 ч. / Под. ред. А. М. Родригеса. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2001. – Ч. 2. – С. 107-130, 170-178.
2. Новейшая история стран Азии и Африки: XX век: Учебник для студентов высших учебных заведений: В 3 ч. / Под. ред. А. М. Родригеса. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2001. – Ч. 3. – С. 27-42, 42-50, 50-66.
3. Васильев Л. С. История Востока. В 2 т. / Л.С. Васильев. - М.: Высш. шк., 2001. – Т. 2. – С. 440-444.
4. Новейшая история стран Европы и Америки. XX в.: В 3 ч. / Под ред. А. М. Родригеса, М. В. Пономарева. – М.: Изд. Центр "Владос", 2001. – Ч. 3. С. 153-191.
5. Заболотный, В. М. Новейшая история стран Европы и Северной Америки: Конец XX – начало XXI века / В. М. Заболотный. – М.: ООО "Издательство АСТ", ООО "Издательство Астрель", 2004. – С. 350-395.
6. Всемирная история новейшего вргмени: Справ. пособие / Е.А. Долгучиц, Е.Г. Колб, В.И. Меньковский и др. – Мн.: Экоперспектива, 1998. – 203 с.


### Тэма 2. Мусульманскі свет з 1945 г. да нашых дзен.

1. Турцыя.
2. Іран.
3. Афганістан.
4. Егіпет.
5. Асаблівасці развіцця іслама і ідэалогіі мусульманскіх краін. Ісламскі фундаменталізм.

*Літаратура:*

1. Васильев, Л. С. История Востока. В 2 т. / Л.С Васильев. - М.: Высш. шк., 2001. – Т. 2. – С.348-351, 373-383.
2. Новейшая история стран Азии и Африки: XX век: Учебник для студентов высших учебных заведений: В 3 ч. \ Под. Ред. А. М. Родригеса. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2001. – Ч. 3. – С. 4-42, 161-164.
3. Новейшая история стран Азии и Африки: XX век: Учебник для студентов высших учебных заведений: В 3 ч. / Под. Ред. А. М. Родригеса. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2001. – Ч. 2. – С. 5-22.
4. Еремеев,Д. Е. Ислам. Образ жизни и стиль мышления / Д.Е.Еремеев. – М.: Политиздат, 1989. – 286 с.
5. Жданов Н. В., Игнатенко, А. А. Ислам на пороге XXI века / Н.В.Жданов, А.А. Игнатенко. – М.: Политиздат, 1989. – 349 с.

### Тэма 3. Сусветная навука і культура ў другой палове XX ст. и на сучасным этапе.

1. НТР ва ўмовах постіндустрыяльнага грамадства. Асноўныя накірункі і перспектывы развіцця сучаснай навукі.
2. Глабалізацыя і развіццё культуры. Новыя тэхналогіі і культура. Масавая і элітарная культура.
3. Шматграннасць літаратурных працэсаў ў другой палове XX ст і на сучасным зтапе. Лацінаамерыканская і японская літаратура.
4. Кінамастацтва ў другой палове XX – пачатку XXI ст. Жанры, тэхналогіі, нацыянальныя школы.
5. Музыка другой паловы XX – пач. XXI ст.
6. Асноўныя накірункі развіцця выяўленчага мастацтва. Новыя тэхналогіі і сінтэз тэхнік у жывапісу.

*Літаратура:*

1. Яковец, Ю.В. Циклы, кризисы, прогнозы / Ю.В. Яковец. – М.: АСТ, 1999. – 353 с.
2. Дубянецкі, Э.С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзен: Папулярны энцыклапедычны даведнік / Эдуард Дубянецкі. – Мн.: “Беларуская энцыклапедыя”, 2001. – С. 213-237.
3. Мировая художественная культура.В.2 т. Том 2 / Под ред. проф. Б.А. Эрнегросс. – М.: Высшая школа, 2005. – 511 с.
4. Торосян, В.Г. Культурология: История мировой и отечественной культуоы: учеб. пособие для студентов, обуч. по пед. специальностям / В.Г. Торосян. – М.: гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2005. – С. 426-483, 532-536, 698-733.
5. Новейшая история России. 1914 – 2002: Учебное пособие / Под ред. М. В. Ходякова: - М.: Юрайт – издат, 2004. – С. 335-343, 417-421.

## ПЫТАННІ ДЛЯ КАНТРОЛЮ СРС ПА ТЭМАХ:

## ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС

1 Якія наступствы мела Першая сусветная вайна для Вялікабрытаніі?
2 Што такое “ллойдджарджызм”?
3 Калі і ў сувязі з чым у Вялікабрытаніі назіраўся ўздым рабочага руху?
4 Як развівалася эканоміка Вялікабрытаніі ў гады стабілізацыі?
5 У чым заключаўся канфлікт у вугальнай прамысловасці і якім быў змест закона 1927 г.аб рэгуляванні працоўных адносінаў?
6 З якімі праблемамі сутыкнуўся II лейбарысцкі ўрад і якім чынам гэтыя праблемы вырашаліся?
7 Калі сфарміраваўся і якім быў па партыйнаму складу “нацыянальны урад”?
8 Якія змены адбываліся у брытанскіх палітычных партыях у 1930-х гг.?
9 Якімі былі знешнепалітычныя прыярытэты Вялікабрытаніі ў міжваенны час?

## ІСПАНІЯ Ў МІЖВАЕННЫ ЧАС

10 Якой па форме кіравання была Іспанія пасля Першай сусветнай вайны?
11 У чым спецыфіка сацыяльнай структуры Іспаніі?
12 Якія найбольш уплывовыя палітычныя сілы дзейнічалі ў краіне ў пачатку 1920-х гг.?
13 На якія сацыяльныя слаі абапіраўся Прыма-дэ-Рывера?
14 Якія мэты ставілі перад сабой рэспубліканцы?
15 У чым заключаліся мерапрыемствы рэспубліканскага ўрада?
16 Што такое “Іспанская фаланга”?
17 На якія палітычныя сілы абапіраліся фалангісты?
18 Ад якой падзеі пачалося разгортванне грамадзянскай вайны?
19 Што такое “палітыка неўмяшальніцтва”?
20 Якімі былі вынікі грамадзянскай вайны?
21

## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЕ РАЗВІЦЦЕ ЗАХОДНЯГА ГРАМАДСТВА

22 Якія працэсы ў грамадстве паўплывалі на развіццё культуры?
23 У чым заключалася навуковая рэвалюцыя дадзенага перыяду?
24 Як змяніліся ўмовы жыцця заходняга грамадства?
25 Назавіце найбольш вядомыя дасягененні ў развіцці навукі, тэхнікі, медыцыны?
26 Што такое рэлятывізм у навуцы?
27 Якія мадэрністцкія плыні ў мастацтве вы ведаеце?
28 Што такое сацыялістычны рэалізм?
29 Якія новыя музычныя накірункі з’явіліся ў дадзены перыяд?
30 Каго з найбольш вядомых дзеячаў літаратуры і мастацтва дадзенага перыяду вы можаце назваць

# РАЗВІЦЦЁ ПОСТСАВЕЦКАЙ ПРАСТОРЫ

31 У чым заключаўся сістэмны крызіс пасля распаду СССР?
32 Якім чынам было ўрэгулявана пытанне ядзеных узбраенняў у першай палове 1990-х гг.?
33 Якія палітычныя, этнічныя, эканамічныя працэсы назіраліся у рэспубліках былога СССР?
34 У якім геапалітычным становішчы апынулася Расія ў 1990-х гг?
35 Якімі ў 1990-х гг. былі геапалітычныя арыенціры рэспублік Сярэдняй Азіі, Каўказа, Украіны, Беларусі?
36 Якія змены адбыліся на постсавецкай прасторы на працягу 2000-х гг.?
37 Што такое СНД? Якія дзяржавы ўваходзяць у гэта аб’яднанне?
38 Якія існуюць саюзныя пагаднені ў рамках СНД?

## 4.2 ПЫТАННІ ДЛЯ ЭКЗАМЕНУ

**Пытанні для экзамену па ўсеагульнай гісторыі найноўшага часу для студэнтаў 250 гр. ФІДК.**

1. Змест і перыядызацыя курса гісторыі найноўшага часу. Асноўныя кірункі развіцця сусветнай супольнасці ў ХХ – пачатку ХХІ ст.
2. Глабальныя праблемы сучаснасці і пошук выйсця з іх. Цывілізацыйны крызіс.
3. Наступствы першай сусветнай вайны. Наяўнасць розных альтэрнатыў развіцця краін Захаду ў пасляваенны час.
4. Рэвалюцыі ў Еўропе пасля першай сусветнай вайны. Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі.
5. Версальска-Вашынгтонская сістэма.
6. Стабілізацыя эканамічнага і палітычнага развіцця заходніх краін і міжнародныя адносіны у 1920-я гг.
7. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Расіі.
8. Грамадзянская вайна і палітыка “ваеннага камунізма” ў Расіі. Ваенная інтэрвенцыя краін Антанты ў Расіі.
9. Палітыка НЭПа ў СССР і яе вынікі. Стварэнне СССР.
10. Індустрыялізацыя, калектывізацыя і культурная рэвалюцыя ў СССР.
11. Праблемы і супярэчнасці развіцця савецкага грамадства ў 30-я гг. Культ асобы Сталіна: прычыны ўзнікнення, праявы, наступствы. СССР у 1945 – 1953 гг.
12. Развіццё краін Цэнтральнай і Паўднева-Усходняй Еўропы ў міжваенны час.
13. Вялікабрытанія ў міжваенны час.
14. Іспанія ў міжваенны час. Буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя і яе вынікі.
15. Іспанскі фашызм і яго асаблівасці. Грамадзянская вайна ў Іспаніі і яе наступствы.
16. Сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг. і яго наступствы. “Новы курс” Рузвельта.
17. Прычыны ўзнікнення і асноўныя рысы фашысцкай ідэалогіі. Італьянскі фашызм.
18. Германскі фашызм: умовы ўзнікнення, асаблівасці і змест ідэалогіі.
19. Германія ў гады фашызма (1933-1945).
20. Францыя ў міжваенны час. Урад Народнага фронту.
21. Рабочы рух у міжваенны час. Сацыял-дэмакратыя і яе плыні, камуністычная ідэя, дзейнасць Камінтэрна і Сацінтэрна.
22. Развіццё навукі і культуры ў першай палове ХХ ст.
23. Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін Усходу ў міжваенны час.
24. Ідэалогіі нацыянальна-вызваленчых рухаў: сун’ятсенізм, гандызм, кемалізм, панарабізм, сацыялістычныя ідэі на Усходзе.
25. Сіньхайская рэвалюцыя ў Кітаі і яе вынікі. Палітычнае развіццё Кітая ў першай палове ХХ ст.

26. Кемалісцкая рэвалюцыя ў Турцыі і развіццё краіны ў міжваенны час.
27. Японія ў міжваенны час. Фашызацыя краіны.
28. Індыя ў першай палове XX ст. Абвяшчэнне незалежнасці.
29. Міжнародныя адносіны ў 30-я гг. і напярэдадні другой сусветнай вайны.
30. Другая сусветная вайна: асноўныя падзеі, этапы, вынікі.
31. Вялікая Айчынная вайна: асноўныя падзеі, этапы і вынікі.
32. Міжнародныя адносіны ў 1945 — 1991 гг. Біпалярнасць свету і “халодная вайна”. Лакальныя канфлікты сярэдзіны XX ст.
33. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя: сутнасць, змест, этапы. Эканамічныя, сацыяльныя і культурныя наступствы НТР.
34. Міжнародныя адносіны ў постсавецкі час і ў пачатку XXI ст. Крушэнне біпалярнага свету і пошук шматпалярнасці. Лакальныя канфлікты сучаснасці.
35. Міжнародныя арганізацыі ў палітычнай, эканамічнай, культурнай галіне пасля другой сусветнай вайны.
36. Краіны Захаду ў 50-я-60-я гг.: неаліберальны курс і фарміраванне “грамадства спажывання”
37. Сусветны эканамічны крызіс 70-х гг.. Неакансерватызм.
38. Гістарычная роля сацыял-дэмакратыі і камуністычнага руху пасля другой сусветнай вайны. Еўракамунізм.
39. СССР у 1953-1964 гг.: страты і набыткі “хрушчоўскай адлігі”.
40. СССР у 1965-1985 гг.: праблемы “развітага сацыялізма”.
41. Перабудова ў СССР і яе вынікі. Распад СССР.
42. Краіны сацыялізма ў Еўропе: асаблівасці сацыяльна-палітычнага развіцця ў 1945-1991 гг. і адносіны з СССР. Крушэнне сусветнай сістэмы сацыялізма.
43. Расія і краіны СНД ў постсавецкі перыяд.
44. ЗША ў другой палове 40-х-70-х гг. Пасляваеннае развіццё і неаліберальны курс.
45. ЗША з 80-х гг. XX ст. да нашых дзен. Амерыканскі варыянт неакансератызма і развіццё ЗША на сучасным этапе.
46. Вялікабрытанія ў другой палове 40-х-70-х гг.: праблемы і альтэрнатывы развіцця краіны.
47. Вялікабрытанія з 80-х гг. XX ст. да нашых дзён.
48. Францыя ў 1945 – пачатку 80-х гг.
49. Францыя ў гады “левага эксперымента”. Развіццё краіны ў 90-х гг. XX ст. і на сучасным этапе.
50. Раскол Германіі і стварэнне ГДР і ФРГ. Развіццё ФРГ ў 50-х-70-х гг. XX ст.
51. Германскі неакансерватызм. Аб’яднанне Германіі і праблемы германскага адзінства. Германія на сучасным этапе.
52. Італія з 1945 г. да нашых дзён.
53. Іспанія з 1945 г. да нашых дзён.
54. Японія з 1945 г. да нашых дзен.
55. Кітай ў перыяд мааізма. “Вялікі скачок” і “культурная рэвалюцыя”.

56. Постмааісцкі Кітай і развіццё краіны на сучасным этапе.
57. Індыя пасля другой сусветнай вайны. “Курс Неру”.
58. Індыя падчас кіравання І. Гандзі і яе пераемнікаў. Сучаснае развіццё краіны.
59. Асноўныя тэндэнцыі развіцця мусульманскіх краін пасля другой сусветнай вайны. Турцыя з 1945 г. да нашых дзён.
60. Культура другой паловы XX – пачатку XXI ст і яе шматграннасць ва ўмовах глабалізацыі і інфармацыйнага грамадства.

## 4.3 КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці ажыццяўляецца ў адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў па дзесяцібальнай шкале.

**10 (дзесяць) балаў:**

Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па некаторых асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьмовае і лагічнае выкладанне матэрыялу, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; абгрунтаваная аргументацыя ўласных высноў, здольнасць самастойна і творча выконваць складаныя нестандартныя заданні у рамках вучэбнай праграмы; поўнае і глыбокае засваенне зместу асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне выкарыстоўваць навуковыя дасягненні, звязаныя з іншымі дысцыплінамі; творчая самастойная праца на семінарскіх занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень выканання заданняў.

**9 (дзевяць) балаў:**

Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьмовае і лагічнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; здольнасць самастойна і творча выконваць складаныя нестандартныя заданні ў межах вучэбнай праграмы; поўнае засваенне зместу асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; актыўная самастойная праца на семинарскіх занятках, сістэматычны удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень выканання заданняў.

**8 (восем) балаў:**

Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьмовае і лігічнае выкладанне матэрыялу, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; здольнасць самастойна выконваць складаныя заданні ў межах вучэбнай праграмы; засваенне зместу асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў сутнасці асноўных тэорый і кірункаў навуковай дысцыпліны і аналізаваць іх; актыўная самастойная праца на семінарскіх занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень выканання заданняў.

**7 (сем) балаў:**

Сістэматызаваныя, веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьмовае і лагічнае выкладанне матэрыялу, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; засваенне

зместу асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца у сутнасці асноўных тэорый і кірункаў навуковай дысцыпліны; актыўная самастойная праца на семінарскіх занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі узровень выканання заданняў.

**6 (шэсць) балаў:**

Дастаткова сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай і спецыяльнай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне матэрыялу, уменне абагульняць і рабіць высновы; здольнасць самастойна выконваць тыпавыя заданні ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне зместу асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; самастойная праца на семінарскіх занятках, перыядычны удзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы узровень выканання заданняў.

**5 (пяць) балаў:**

Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы, лагічнае выкладанне матэрыялу, уменне рабіць высновы; здольнасць самастойна выконваць тыпавыя заданні у рамках вучэбнай праграмы; засваенне зместу асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне самастойна працаваць на семінарскіх занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, здавальняючы ўзровень выканання заданняў.

**4 (чатыры) балы - залічана:**

Аб'ём ведаў у рамках базавых ведеў; засваенне зместу асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; лагічнае выкладанне матэрыялу, уменне рабіць простыя высновы без істотных памылак; уменне выконваць тыпавыя заданні пад кіраўніцтвам выкладчыка; здавальняючы ўзровень выканання заданняў.

**3 (тры) балы – не залічана:**

Недастатковы аб'ём ведаў; выкладанне матэрыялу з істотнымі фактычнымі і лагічнымі памылкамі; няўменне выконваць тыпавыя заданні; пасіўнасць на семінарскіх занятках, нізкі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў.

**2 (два) балы – не залічана:**

Фрагментарныя веды; няўменне выкарыстаць навуковую тэрміналопю, наяўнасць у адказе грубых лагічных і фактычных памылак; пасіўнасць на семінарскіх занятках; нізкі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў.

**1 (адзін) бал – не залічана:**

Адсутнасць ведаў і кампетэнцый у рамках адукацыйнага стандарту ці адмова ад адказу.

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ
5.1.ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________ С.Л. Шпарло
«___» _____________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-_____ / вуч.

**УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ**
**РАЗДЗЕЛ 4. НАЙНОЎШЫ ЧАС**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцпліне для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*Прафілізацыя: Культурная спадчына і турызм)*

2024

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках). Рэгістрацыйны нумар 6-05-03-29/23 вуч. от 15. 02. 2023 г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Л. У. Ландзіна****,*** доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ДУА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

*І. Р. Чыкалава,* доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка".

*Д. А. Мігун,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры філасофіі, гісторыі і метадалогіі адукацыі ДУА "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы".

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 25. 01. 2024 г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнай Рады установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № __ ад __ __ 2024 г.).

Адказны за рэдакцыю: ………………………

Адказны за выпуск: Л. У. Ландзіна

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гістарычныя дысцыпліны ўваходзяць у лік асноўных для падрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы. Вывучэнне гісторыі ў ВНУ накіравана на фарміраванне асобы, якая павінна свядома арыентавацца ў грамадскім жыцці, кваліфікавана аналізаваць мінулае і сучаснае, усведамляць прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, паважаць і захоўваць гісторыка-культурную спадчыну. Адзначаныя сацыяльныя і прафесійныя кампетэнцыі ў максімальнай ступені павінны быць у спецыялістаў, занятых у сферы музейнай справы.

Вучэбная праграма прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі. Курс усеагульнай гісторыі найноўшага часу, як з'яўляецца заключнай часткай комплекснага вывучэння ўсеагульнай гісторыі, разглядае гістарычныя працэсы і падзеі з сусветным масштабе на працягу XX – пачатку XXI ст. Асаблівая важнасць і цікавасць адзначага перыяду вызначаецца ўключэннем у гэты перыяд падзей недаўняга мінулага і сучаснасці. Гэта выклікае

эфект уключанасці кожнага, праз уласную памяць ці памяць старэйшага пакалення, ў разглядаемыя працэсы і падзеі.

*Метадалагічнай асновай* выкладання з'яўляецца спалучэнне фармацыйнага і цывілізацыйнага (культуралагічнага) падыходаў. Гэта дазваляе, з аднаго боку, прасачыць стадыяльнасць і змену этапаў грамадскага развіцця, а з другой – максімальна ўлічыць цывілізацыйныя асаблівасці асобных краін і рэгіёнаў. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызма і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці.

У праграме адлюстраваны таксама комплекс праблем, якія характэрызуюць сацыякультурнае развіццё грамадства. Адпаведна, вывучаецца развіццё навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацкай культуры перыяда. Зроблены акцэнт на вывучэнне гісторыі паўсядзеннасці, што ўключае не толькі вывучэнне матэрыяльнай культуры, але і разгляд сацыяльнай псіхалогіі, індывідуальных і калектыўных уяўленняў, эвалюцыі гендэрных, сямейна-шлюбных адносінаў і г.д.

*Мэтай* курса усеагульнай гісторыі найноўшага часу з'яўляецца фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў-музеязнаўцаў і іх сацыялізацыі, што прадуглеждвае таксама і ўменні набываць новыя веды і прымяняць іх ў прафесійным і штодзенным асяроддзі.

Адзначаная мэта прадугледжвае вырашэнне наступных *задач:*

- вызначэнне месца, ролі і зместа перыяда найноўшай гісторыі;
- абгрунтаванне перыядызацыі, і таксама высвятленне праблем вылучэння перыядаў;
- усведамленне цэласнасці сусветна-гістарычнага працэсу;
- стварэнне комплекснай карціны развіцця сусветнай цывілізацыі з сістэмным бачаннем гістарычнага працэса праз сінхранізацыю, правядзенне аналогій, параўнанне, вылучэнне сувязяў прычын і наступстваў;
- раскрыццё унутранай логікі гістарычных працэсаў і падзей, прасочванне іх дынамікі і ўзаемасувязі;
- выхаванне цікавасці і павагі да гісторыка-культурнай спадчыны іншых народаў; суаднясенне дасягненняў сусветнай і айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры;
- забеспячэнне пераемнасці і ўзаемасувязі матэрыяла выкладаемага курса як з ведамі, атрыманымі ў агульнаадукацыйнай школе, так і са зместам сумежных дысцыплін праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння курса студэнт *павінен ведаць:*

- гістарычнае значэнне перыяда, крытэрыі перыядызацыі, змест і структуру курса;
- асноўныя тэндэнцыі, працэсы і падзеі ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;
- сувязь прычын і наступстваў гістарычных падзей і працэсаў, суадносіны гістарычнай пераемнасці і нераўнамернасці;
- асаблівасці зместу і развіцця заходняй і усходняй цывілізацыйнай мадэлі;

- уплыў сацыяльных і культурных інстытутаў на практыку палітычнай дзейнасці.

Студэнт павінен *умець:*

- выкарыстоўваць асноўныя і дадатковыя крыніцы па выкладаемым курсе, вызначаць іх змест і сацыяльную накіраванасць;
- аналізаваць гістарычныя працэсы і падзеі, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;
- чытаць інфармацыю гістарычных карт, схем, дыяграм, а таксама ілюстрацыйнага матэрыялу;
- прымяняць у кантэксце сусветнай гісторыі веды па сумежных дысцыплінах (сусветнай мастацкай культуры, філасофіі, сусветнай літаратуры, рэлігіязнаўстве, культуралогіі, айчынай гісторыі і г.д.).
- Зместам вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 1. Старажытны свет” прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках):
- ВК – 4 – Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;
- ВК – 7 – Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадскасці і патрыятызма;
- БПК – 2 – Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцей, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыякультурную сітуацыю.
- У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 4. Найноўшы час” прадугледжана 164 гадзін, з іх аўдыторных 72, самастойнай работы студэнтаў – 18 гадзін. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

### *Тэма 1. Прадмет і мэты курса. Гістарычны змест найноўшага часу. Перыядызацыя*

Месца найноўшай гісторыі ў сусветным гістарычным працэсе. Храналагічныя рамкі. Перыядызацыя. Асноўныя праблемы курса.

Першая і Другая сусветныя войны. Альтэрнатыўнасць мадэляў развіцця краін пасля Першай сусветнай вайны. Буржуазная дэмакратыя. Савецкая мадэль. Фашызм. Біпалярнасць свету пасля Другой сусветнай вайны. “Халодная вайна” і яе праявы. Лакальныя канфлікты пасля Другой сусветнай вайны. Крушэнне каланіялізма. “Тры міры”. Змены ў міжнародных адносінах пасля 1985 г. Распад СССР і крушэнне біпалярнага свету. Праблемы і перспектывы постсавецкай прасторы.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Постіндустрыяльнае (інфармацыйнае) грамадства. Карэнныя змены і тэхналогіях, ладзе і стылі жыцця. Сацыяльныя наступствы НТР. Цывілізацыйны крызіс і пошукі шляхоў выйсця з яго. Шматграннасць і стылевая разнастайнасць культуры у ХХ – пачатку ХХІ ст.

## Раздзел І. Краіны свету ў міжваенны час

### *Тэма 2. Вынікі Першай сусветнай вайны. Версальска-Вашынгтонская сістэма*

Заканчэнне Першай сусветнай вайны. Эканамічны і сацыяльна-палітычны стан краін Захаду пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Капітуляцыя Германіі. Парыжская мірная канферэнцыя. Пазіцыі і інтарэсы вядучых дзяржаў. Версальскі дагавор з Германіяй, яго ўмовы і наступствы. Падпісанне дагавароў з Аўстрыяй, Турцыяй, Балгарыяй, Венгрыяй. Знікненне імперый і развіццё нацыянальных дзяржаў. Адносіны да Савецкай Расіі. Стварэнне Лігі Нацый і яе задачы. Імкненне ЗША да гегемоніі. Вашынгтонская канферэнцыя. “Дагавор пяці дзяржаў”. “Дагавор дзевяці дзяржаў”. Афармленне Версальска-Вашынгтонскай сістэмы, яе моцныя і слабыя бакі.

### *Тэма 3. Міжнародныя адносіны ў 20-я – 30-я гг. ХХ ст. Стварэнне асяродкаў Другой сусветнай вайны*

Усталяванне Версальска-Вашынгтонскай сістэмы і стабілізацыя 20-х гг. “Рускае”, “польскае” і “германскае” пытанні і іх вырашэнне. Савецка-германскае збліжэнне. Генуэзская канферэнцыя і Рапальскі дагавор. План Даўэса. Прызнанне СССР заходнімі краінамі. Роля Лігі Нацый. Пакт Брыяна-Келага. Імкненне Германіі да статуса раўнапраўнай дзяржавы. Дапамога Германіі з боку ЗША і Вялікабрытаніі. Уступленне Германіі ў Лігу Нацый.

Змены на міжнароднай арэне пасля ўсталявання фашысцкіх рэжымаў. Знешнепалітычныя прэтэнзіі Італіі. Японска-савецкія і японска-кітайскія адносіны. Увядзенне германскіх войскаў у Рэйнскую дэмілітарызаваную зону. Аншлюс Аўстрыі. “Мюнхенская змова”. “Палітыка суцішэння” Германіі з боку заходніх краін. Намаганні СССР па стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі, прычыны іх няўдачы. Перадумовы савецка-германскага збліжэння. Пакт аб ненападзенні. Сакрэтны пратакол і яго змест. Падрыхтоўка нападзення Германіі на Польшчу. Пагаршэнне сітуацыі на Далекім Усходзе.

### *Тэма 4. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Расіі. Грамадзянская вайна*

Становішча ў краіне вясной–восенню 1917 г. Альтэрнатывы развіцця расійскага грамадства. Палітычныя партыі і іх праграмы. Крызісы Часовага ўрада. Нота Мілюкова. Правал наступлення на фронце. Агітацыйная работа бальшавікоў. Крызіс улады летам 1917 г. Мяцеж Л. Карнілава і яго наступствы. Абвяшчэнне Расіі рэспублікай. Бальшавізацыя Саветаў. Падрыхтоўка і правядзенне ўзброенага паўстання ў Петраградзе.

ІІ Усерасійскі з’езд Саветаў. Першыя дакрэты савецкай улады. Мерапрыемствы ў эканамічнай і сацыяльнай галінах. Усталяванне савецкай

улады ў рэгіёнах былой Расійскай імперыі. Барацьба за выхад з вайны. Брэсцкі дагавор, яго ўмовы і наступствы.

Пачатак Грамадзянскай вайны. Роспуск Устаноўчага сходу. "Чырвоны" і "белы" тэрор. Стварэнне УНК. Сацыяльны склад і палітычныя мэты "белага" і "чырвонага" лагераў. Лёс царскай сям'і. Ваенныя дзеянні 1918–1921 гг. Стварэнне Чырвонай арміі. Барацьба з Дзенікіным, Калчаком, Юдзенічам, Врангелем. Прычыны няўдачы "белага" руху. Інтэрвенцыя заходніх краін у Савецкую Расію. Барацьба з Польшчай. Барацьба з нацыянальна-дэмакратычнымі партыямі ў Беларусі, Украіне, Сярэдняй Азіі і на Каўказе.

Сацыяльна-эканамічнае становішча краіны. Палітыка "ваеннага камунізму" і яе мерапраемствы. Сацыяльныя праблемы ў грамадстве і антыбальшавіцкія паўстанні. Перадумовы пераходу да НЭПа.

### *Тэма 5. Буржуазна-дэмакратычныя рэвалюцыі ў Еўропе пасля Першай сусветнай вайны*

Наяўнасць розных мадэляў грамадскага развіцця ў міжваенны час. Фактар распаўсюджання ідэй сацыялізма і нацыянальнага самавызначэння.

Лістападаўская рэвалюцыя 1918–1919 гг. у Германіі. Прычыны і пачатак рэвалюцыі. Сацыял-дэмакраты і камуністы. Саветы і СНУ – германскі варыянт дваеўладдзя. Мерапрыемствы СНУ ў рамках рэфармісцкай мадэлі. Барацьба камуністаў і сацыял-дэмакратаў. I Усегерманскі з'езд Саветаў. Стварэнне КПГ. Падаўленне камуністычнага руху ў Германіі. Савецкая рэспубліка ў Баварыі і яе падзенне. Выбары ў Нацыянальны сход. Абвяшчэнне Веймарскай рэспублікі. Канстытуцыя 1919 г.. Значэнне Лістапаўскай рэвалюцыі.

Рэвалюцыя 1918 г. у Аўстрыі. Абвяшчэнне Аўстрыі рэспублікай. Стварэнне КПА. Устанаўленне буржуазна-дэмакратычнага ладу ў краіне. Рэвалюцыя 1919 г. у Венгрыі. Абвяшчэнне рэспублікі, ўтварэнне КПВ. Савецкая рэспубліка ў Венгрыі.

### *Тэма 6. Заходняе грамадства ў 20-я – 30-я гг. ХХ ст. Стабілізацыя і сусветны эканамічны крызіс*

Фактары эканамічнага развіцця. Навукова-тэхнічны прагрэс. Адкладзены попыт. Станаўленне масавай вытворчасці, канвеернай сістэмы, стварэнне новых галін прамысловасці. Стабілізацыя у сацыяльна-палітычным жыцці грамадства. Сацыял-рэфармізм і буржуазна-дэмакратычная мадэль. Урбанізацыя. Змены ў ладзе жыцця і сацыяльнай структуры грамадства. Рабочы і сацыял-дэмакратычны рух у перыяд стабілізацыі.

Прычыны і пачатак сусветнага эканамічнага крызісу. Праявы крызіса ў прамысловасці, аграрным сектары, фінансах, знешнім гандлі. Сацыяльныя наступствы крызісу і этатысцкія меры выхаду з яго. "Новы курс" як прыклад дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Вынікі выбараў 1932 г. ў ЗША. Групы мерапрыемстваў у рамках "новага курса". "Санацыя" прамысловасці, сельскагаспадарчай вытворчасці, банкаў. Прымусовае картэліраванне. Сістэма

мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва і сацыяльнай падтрымцы беспрацоўных. Вынікі “новага курса”.

### *Тэма 7. Рабочы рух у міжваенны час*

Сацыял-дэмакратыя, яе радыкальная і рэфармісцкая плыні. Стварэнне Камуністычнага Інтэрнацыянала і дамінаванне ў ім УКП(б). Бернскі Інтэрнацыянал. “2 1/2-ы” Інтэрнацыянал. Стварэнне камуністычных партый у еўрапейскіх краінах у 20-я–30-я гг. Стварэнне Сацыялістычнага Інтэрнацыянала. Прафсаюзны рух і яго роля.

Удзел сацыял-дэмакратаў у палітычным жыцці заходніх краін. Стабілізацыя 20-х гг. і яе ўплыў на рабочы рух. Канфрантацыя сацыял-дэмакратаў і камуністаў і яе ўплыў на разгортванне падзей у асобных еўрапейскіх краінах. Сусветны эканамічны крызіс і яго ўплыў на рабочы рух. Барацьба за адзіны фронт супраць фашызму ў 1930-я гг.

### *Тэма 8. Фашызм у Італіі*

Канцэпцыі сутнасці і прычын ўзнікнення фашызма. Палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, псіхалагічныя карані фашызма. Фашызм як агульнаеўрапейская з’ява. Уплыў на фашызацыю Еўропы вынікаў Першай сусветнай вайны. “Феномен натоўпу” індустрыяльнага грамадства. Асобасныя характарыстыкі фашысцкіх лідэраў і іх уздзеяння на аўдыторыю. Тэарэтычныя асновы фашызма. Антыгуманнасць фашысцкай ідэалогіі.

Італія – краіна ўзнікнення фашызма. Становішча ў краіне. Праграма Б. Мусаліні. Палітычны крызіс 1922 г. і прыход фашыстаў да ўлады. Змены ў палітычным ладзе краіны. Пагадненне Ватыкана з урадам Мусаліні. Авенцінскі блок. Эканамічнае развіццё Італіі ў гады фашызма. “Карпаратыўная дзяржава” і “рэжым аўтаркіі”. Знешнепалітычныя мэты Італіі напярэдадні Другой сусветнай вайны.

### *Тэма 9. Германія ў гады нацызма (1933–1945)*

Эканамічныя, сацыяльна-палітычныя і псіхалагічныя карані германскага фашызма. Канцэптуальная распрацоўка фашысцкай ідэалогіі. Стварэнне НСДАП. “Піўны путч”. Эканамічныя і палітычныя складанасці Веймарскай рэспублікі. Барацьба нацыстаў за лідэрства ў палітычным жыцці. Падпал Рэйхстага і Лейпцыгскі працэс. Падтрымка нацыстаў вярхушкай германскай буржуазіі. Прычыны няўдачы стварэння адзінага антыфашысцкага фронта ў Германіі. Прыход Гітлера да ўлады і трансфармацыя палітычнай сістэмы.

Унутраная палітыка “Трэцяга Рэйха”. Адносіны да розных палітычных, нацыянальных і сацыяльных груп у грамадстве. Таталітарная сістэма. Зліцце партыйнай улады з дзяржаўнай. Эканамічнае развіццё Германіі. Этатызм. Прыярытэтныя накірункі развіцця прамысловасці. Знешнепалітычныя мэты Германіі і іх рэалізацыя напярэдадні Другой сусветнай вайны.

### *Тэма 10. Іспанія ў 20-я – 30-я гг. Грамадзянская вайна і ўсталяванне фашызма*

Спецыфіка развіцця краіны. Ваенна-манархічная дыктатура Прыма дэ Рывера. Пачатак рэвалюцыі і ўстанаўленне рэспублікі. Мерапрыемствы рэспубліканскага ўрада. Стварэнне Народнага фронта і яго перамога на выбарах 1936 г.. Асаблівасці іспанскага фашызма. Фашысцкі мяцеж. Грамадзянская вайна 1936–1939 гг. Абарона Мадрыда і меры рэспубліканскага ўрада. Міжнародная салідарнасць з Іспанскай рэспублікай. Роля СССР. Палітыка "неўмяшальніцтва" заходніх краін. Італа-германская інтэрвенцыя. Падзенне рэспублікі і яго прычыны. Усталяванне дыктатуры Ф. Франка.

### *Тэма 11. Францыя ў 20-я – 30 я гг. XX ст.*

Шматпартыйнасць і палітычная нестабільнасць як рыса палітычнага жыцця краіны. "Нацыянальны блок", яго праграма і мерапрыемствы. "Левы блок". Урад Р. Пуанкарэ і яго дзейнасць. Знешняя палітыка Францыі ў 20-я гг. Рурскі крызіс. Адносіны з СССР і Германіяй.

Сусветны эканамічны крызіс і яго ўплыў на Францыю. Урадавая нестабільнасць. Актывізацыя фашысцкага руху і яго спецыфіка ў Францыі. Стварэнне Народнага фронту і яго прыход да ўлады. Мерапрыемствы Народнага Фронту і іх значэнне. Прычыны падзення Народнага фронту.

Пагаршэнне ўнутрыпалітычнага становішча Францыі ў другой палове 30-х гг. Актывізацыя прапаганды фашысцкіх і правых партый. Знешнепалітычныя арыеціры ўрада Францыі. Каланіяльная палітыка Францыі. Становішча краіны напярэдадні Другой сусветнай вайны.

### *Тэма 12. Краіны Цэнтральнай і Паўднева-Усходняй Еўропы ў міжваенны час*

Асаблівасці эканамічнага, сацыяльна-палітычнага і інацыянальнага развіцця рэгіёну. Палітычная нестабільнасць. Фашызацыя краін. Змяненні меж краін па ўмовах Версальска-Вашнгтонскай сістэмы.

Эканамічны ўздым 20-х гг. у Чэхаславакіі. Т. Масарык як ідэолаг чэхаславацкай дзяржаўнасці. Сусветны эканамічны кразіс і яго праявы ў Чэхаславакіі. Знешнепалітычныя мэты Чэхаславакіі і яе лёс у 1938–1939 гг.

Усталяванне таталітарных рэжымаў у Балгарыі і Югаславіі. Адраджэнне незалежнасці Польшчы. Дзейнасць першага польскага ўрада. Ю. Підсудскі. Польска-савецкая вайны. Рыжскі мірны дагавор. Пераварот 1926 г. Рэжым санацыі. Польшчы і сусветны эканамічны крызіс. Адносіны Польшчы з Германіяй і СССР напярэдадні Другой сусветнай вайны.

### *Тэма 13. СССР у 20-я-30-я гг.*

Наступствы грамадзянскай вайны і палітыкі "ваеннага камунізма". Супраціўленне ўладзе бальшавікоў. Кранштадскае паўстанне. Сутнасць НЭПа. НЭП у сельскай гаспадарцы, прамысловасці, фінансах, гандлі. Вынікі і прычыны згортвання НЭПа. Адносная дэмакратызацыя палітычнага жыцця ў 20-я гг.

Дзейнасць прафсаюзаў, камсамола, нацыянальных і жаночых арганізацый. Аўтарытарныя тэндэнцыі ў кіраванні краінай. Утварэнне СССР. Смерць У. І. Леніна і ўнутрыпартыйная барацьба. Супрацьстаянне І. В. Сталіна і Л. Д. Троцкага. Знешнепалітычнае становішча СССР у 20-я гг. Савецка-германскія адносіны і "паласа прызнанняў" СССР.

Сталінская мадэль развіцця СССР і яе ўсталяванне ў 30-я гг. Індустрыялізацыя. Калектывізацыя. Культурная рэвалюцыя. Іх мэты, правядзенне, вынікі. Прычыны і фактары ўсталявання культу асобы Сталіна. Канстытуцыя 1936 г. Фарміраванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы і бюракратыі. Змены ў складзе УКП(Б). Палітычныя працэсы 30-х гг. Разгром фракцыйных груповак у УКП(б). Масавыя рэпрэсіі ў горадзе і на вёсцы. Спалучэнне таталітарызму ў кіраванні і энтузіязму працоўных.

СССР напярэдадні Другой сусветнай вайны. Мабілізацыя рэсурсаў і ўмацаванне дырэктыўных метадаў кіравання. Адносіны з Германіяй і падпісанне Пакта аб ненападзенні.

### *Тэма 14. Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін Азіі ў міжваенны час*

Становішча азіяцкіх краін як калоній і напалову калоній заходніх дзяржаў. Сельская гаспадарка і панаванне монакультур. Прамысловасць і яе пачатковае становішча. Укладанні замежнага капітала ў эканоміку азіяцкіх краін, іх фінансавая і палітычная залежнасць ад крэдытораў і інвестараў. Традыцыйны ўклад жыцця. Каставыя, кланавыя, радавыя перажыткі. Рэлігійны і нацыянальны фактары ў сацыяльных адносінах і канфліктах. Трансфармацыя традыцыйнага ладу жыцця пад уплывам заходніх краін.

Становішча *Японіі* як адзінай дзяржавы, якая пазбегла ператварэння ў калонію. Стабілізацыя 20-х гг. Барацьба за знешнія рынкі. Частковая лібералізацыя 20-х гг. і фашызацыя краіны ў 30-я гг. Японскі мілітарызм, узмацненне тэннаізму і самурайскага духу. Мемарандум Танака. Япона-амерыканскія супярэчнасці. Захоп Маньчжурыі. Нападзенне на Кітай. Сутыкненні з СССР на Далёкім Усходзе.

### *Тэма 15. Ідэалогія і практыка нацыянальна-вызваленчых рухаў азіяцкіх краін*

Гандызм. Грамадскія і гуманістычныя погляды М. К. Гандзі. Ахімса, сварадж, сац'яграха. Мірнае супраціўленне. Закон аб кіраванні Індыяй 1919 г. Дзейнасць Індыйскага Нацыянальнага кангрэса. ІНК і Мусульманская Ліга. Фарміраванне радыкальнага і камуністычнага руху ў Індыі. Роля М.К. Гандзі ў вызваленні Індыі ад англійскага панавання.

"Шэсць прынцыпаў" кемалізма. Кемаліскцкая рэвалюцыя 1918 г. Дзейнасць М. Кемаля па кансалідацыі грамадства. Абвяшчэнне Турцыі рэспублікай. Прыняцце першай рэспубліканскай канстытуцыі і рэфармаванне грамадства. Усталяванне аднапартыйнага рэжыма.

"Тры народных прынцыпа" Сунь Ятсена. Стварэнне партыі Гаміньдан. Сіньхайская рэвалюцыя ў Кітаі. Палітычная барацьба ў краіне. Прычыны і

асаблівасці рэвалюцыі 1925–1927 гг. Раскол краіны. Пераварот Чан Кайшы. Інтэрвенцыя заходніх дзяржаў. Мерапрыемствы урада Гаміньдана. Адносіны з СССР і ваенная дапамога Савецкага Саюза. Гаміньдан і Камуністычная партыя Кітая. Узнікненне савецкіх раёнаў і I з'езд саветаў Кітая. Барацьба Гаміньдана і КПК. Становішча краіны напярэдадні Другой сусветнай вайны.

### *Тэма 16. Сацыякультурнаае развіццё грамадства ў міжваенны час*

Крызіс рацыяналістычнай свядомасці. Разнастайнасць філасофскіх сістэм у XX ст. Марксізм, ніцшэанства, неапазітывізм, экзістэнцыялізм, інтуітывізм і г.д. Якасныя змены ў развіцці навукі. Тэхнічная рэвалюцыя. Развіццё фізікі і даследаванне атама (А. Эйнштэйн, Э. Рэзерфорд, М. Планк, Н. Бор, І. Курчатаў, С. Каралёў, П. і М. Кюры). Прагрэс у хіміі, генетыцы, медыцыне, мікрабіялогіі, псіхіятрыі (З. Фрэйд і інш.). Тэхніка і змяненні ў паўсядзенным жыцці. Мадэрнізацыя грамадства, масавая вытворчасць, урбанізацыя, эмансіпацыя жанчыны. Развіццё масавай культуры.

